# У тэрмін і добраякасна правесці веснавую сяўбу

*З выступлення т. Н. Ф. ГІКАЛО на Усебеларускім злёце ударнікаў-брыгадзіраў калгасных брыгад*

Таварышы калгаснікі-брыгадзіры, ударнікі, барацьбіты за большэвіцкія калгасы! Вы сабраліся тут напярэдадні веснавой сяўбы, каб праверыць яшчэ раз, як падрыхтаваліся да гэтай веснавой кампаніі, абмяняцца вопытам, выправіць сваю работу, канкрэтна падлічыць, з чым мы пачынаем веснавую сяўбу.

Вы павінны не толькі ў кароткія тэрміны пасеяць, але дабіцца правільнага выкарыстання ўсіх тых матар'яльных цэннасцей, якія ёсць у нас у калгасах. Але мала таго, вы павінны арганізаваць і тых людзей, якія ёсць у вашым распараджэнні, арганізаваць іх так, каб чалавечая праца ў вашай брыгадзе дала найбольшую колькасць цэннасцей для будаўніцтва социялізма ў нашай краіне.

Адсюль і зразумелы той непакой і хваляванне, якія праяўляе сёння кожны калгаснік-брыгадзір, што знаходзіцца тут на злёце. Трэба яшчэ і яшчэ раз праверыць, як праведзена падрыхтоўка да сяўбы не толькі ва ўсім калгасе, але на кожным яго паасобным участку. Як справа з насеннем, з канём з трактарам і т. д. Тут важна ўлічыць кожную дробязь, кожную дэталь, бо ў час сяўбы ўсякая дробязь надзвычай важна. Калі своечасова на яе не звярнуць увагі, можна шмат пашкодзіць у час сяўбы.

Калгасная брыгада—гэта вельмі вялікая справа. Брыгадзір у калгаснай вытворчасці з'яўляецца цэнтральнай фігурай. Брыгадзір рашае поспех вытворчасці. Брыгадзір кіруе сельска-гаспадарчымі работамі непасрэдна на полі. Ад яго цвёрдай лініі, умення і кіраўніцтва залежыць поспех веснавой сяўбы. Няхай брыгада будзе маленькая—у 5 чал., няхай невялікі ўчастак зямлі ў брыгады, але пры правільнай арганізацыі працы і правільнай расстаноўцы людзей брыгада можа правесці добраякасна сяўбу ў кароткія тэрміны і дабіцца вялікіх рэзультатаў.

У рабоце брыгады галоўнае рашае арганізаванасць. Трэба так паставіць справу, каб людзі адказвалі за даручаную ім работу. І брыгадзір, арганізоўваючы людзей, павінен на кожным канкрэтным участку сваёй работы дабіцца няўхільнага выканання сваіх распараджэнняў.

Брыгадзір павінен быць цвёрдым і моцным у сваіх дзеяннях. Дрэнна, калі людзі палохаюцца, пачынаюць развіжаць, нэрвавацца ў час работы—як і што сеяць.

Кожная культура мае свой час, патрабуе што называецца асобага падыходу і адпаведнай арганізаванасці. Трэба папярэдзіць кожнага

калгасніка, кожнага брыгадзіра ад агульнага несур'ёзнага падыходу да сяўбы, каб не загубіць справу.

Тут адзін таварыш калгаснік з Хойніцкага раёна вельмі правільна гаварыў, што ў паасобных месцах недастаткова сур'ёзна падыйшлі да звышранняй сяўбы. Звышранняя сяўба патрабуе сур'ёзнай падрыхтоўкі. Трэба добра падрыхтаваць глебу, выдзеліць лепшых коняй, лепшых сейбітаў, ведаючых і разумеючых справу. А ў Дубровенскім раёне, напрыклад, калгаснікі звышранню сяўбу праводзілі проста па цаліне, па гразі. Такі пасеў яўна ніякіх рэзультатаў даць не можа. Работа калгаснікаў у гэтым годзе павінна быць арганізавана з улікам усяго новага, што ў нас ёсць, з улікам вопыту людзей, ведаючых справу. Мы павінны дабіцца, каб кожны калгаснік адказваў за сваю справу, за любую даручаную яму работу з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю. Мы павінны правесці сяўбу на выдатна.

Калгаснікі БССР маюць усе ўмовы для таго, каб забяспечыць сабе заможнае жыццё. Для гэтага патрабуецца толькі, каб калгаснікі чэсна працавалі, своечасова засеялі, своечасова прапалолі, своечасова ўбралі і без страт.

* * *

Адна з цэнтральных задач веснавой сяўбы—гэта беражлівыя і ўважлівыя адносіны да каня, да машыны. Тут правільна выступалі таварышы і гаварылі, што ў паасобных калгасах наглядаюцца варварскія адносіны да каня. Класавы вораг—кулак, прабуючы падарваць калгаснае будаўніцтва, разваліць калгасы, найбольшыя намаганні сканцэнтраваў на ўчастку социялістычнай жывёлагадоўлі. Ён прымае ўсе меры к таму, каб вывесці коняй са строю. У нас не мала фактаў, калі з-за шкодніцкай работы класавага ворага кулака пры адсутнасці пільнасці саміх калгаснікаў не мала коняй вышла са строю. Коні не чысцяцца, дрэнна кормяцца, і гэта пры забяспечанні поўнасцю кармамі.

Трэба пакласці канец гэтым варварскім адносінам да каня. Той калгаснік, які не ўлічвае ўсёй шкоднасці нядбайных адносін да каня, робіць вялікае злачынства. За апошнія гады ў Беларусь увезена шмат трактароў. Зараз на калгасных палях працуюць звыш 3000 трактароў, але конь астасцца яшчэ незамянімай сілай у калгасе, і яму трэба аддаць больш увагі.

Зараз для коняй наступае перыяд найбольш напружаных работ. Калі мы не ўстановім беражлівы догляд каня, мы веснавую сяўбу ў кароткія тэрміны не выцягнем. Трэба каня своечасова накарміць і так накарміць, каб ён і ў целе быў і мог добра працаваць.

Калгасны конь павінен быць па выгляду такім, каб яго можна было пазнаць здалёк, каб на яго, як кажуць, было люба паглядзець.

Мы павінны дабіцца і беражлівых адносін да тых складаных машын, асабліва да трактароў, якія ёсць у нашых калгасах. Мы ў гэтым годзе лепш правялі рамонт трактароў, чым у мінулым. Нашы трактары забяспечаны ўсімі часткамі. Але калі не будзе добрага догляду за трактарам, трактар не будзе рацыянальна выкарыстан—ён хутка выйдзе са строю. Ужо асобныя сігналы ў гэтых адносінах мы маем. У Барысаўскім раёне, у саўгасе «Палелюм» з 12 трактароў, якія вышлі ў поле адразу пасля скачэння рамонту, працавалі 6, другія-ж 6 сталі. Гэта значыць, што пры рамонце не было адпаведнага догляду, не было праверкі кантролю пры прыёмцы трактароў пасля рамонту.

* * *

Мы маем у гэтым годзе ўсе магчымасці, каб правесці веснавую сяўбу лепш, чым калі-б там ні было. Пролетарская дзяржава вельмі многа зрабіла і робіць для таго, каб калгаснікі хутчэй сталі заможнымі. Каля сотні трактароў дадаткова ў гэтым годзе завезена ў Беларусь. Апрача таго совецкі ўрад аказаў у гэтым годзе вялікую дапамогу нуждаючымся калгаснікам, прадаставіўшы ім харчовую і насенную пазыку па аўсу, ільнанасенню, па пшаніцы. Становішча з насеннем ў гэтым годзе ў нас у рэспубліцы лепшае, чым калі-б там ні было. Увогуле ўсхожасць насення па рэспубліцы звыш 85 проц. Ды палітычны настрой калгаснікаў і аднаасобнікаў у гэтым годзе таксама лепшы, чым у мінулым. Кожны калгаснік ды кожны селянін бачаць, якую дапамогу аказвае ім пролетарская дзяржава, каб яны сталі на ногі, каб жылі заможна. Мы маем вялікую цягу з боку аднаасобнікаў у калгасы. Усё гэта абавязвае калгаснікаў узорна па-калгаснаму адносіцца да выканання сваіх дзяржаўных абавязацельстваў, ласпяхова, добраякасна правесці сяўбу.

Між тым, рад трывожных сігналаў гаворыць аб тым, што мы яшчэ не падрыхтаваліся да сяўбы так, як гэта трэба. Праўда, у гэтым годзе падрыхтоўка да сяўбы прайшла ў нас значна лепш, чым у мінулым годзе. Але ў параўнанні з іншымі абласцямі і рэспублікамі, мы прыкметна адстаем, хоць здолелі-б зрабіць значна больш таго, што зрабілі. І таму ў невялікі адрэзак часу, які астаецца да сяўбы, мы павінны выправіць нашы недахопы ў сэнсе ачысткі насення, рамонту трактароў, забраніраваць на пасеўную кампанію канцэнтраваныя кармы для коняй і т. д. Мы не павінны супакойвацца да таго часу, пакуль не выйдзем у перадавыя рады абласцей і рэспублік Совецкага саюза.

Мінулы год, гавораць, мы правялі нядрэнна. Але саюзны ўрад, разгледзеўшы вынікі правядзення сельскагаспадарчага года па цэламу раду абласцей, выдзеліў 5 абласцей—Маскоўскую вобласць, Горкаўскі край, Крым, Татарыю, Заходні Сібір, якія былі ўзнагароджаны вышэйшымі ўзнагародамі—ордэнам Леніна.

А хіба, таварышы, у нас не было такіх магчымасцей, каб быць у першых радах сярод другіх рэспублік і абласцей?

Я павінен сказаць—у нас больш такіх магчымасцей, чым у іншых абласцях. Мы з пункту погляду матар‘яльных рэсурсаў багацей цэлага раду краёў і абласцей. Але ў нас пакуль нехапае той баявой зарадкі, каб кожны работнік, кожны калгаснік, кожная наша арганізацыя, пачынаючы ад Соўнаркома, наркаматаў, старшынь РБК, дырэктароў МТС, старшынь калгасаў, брыгадзіраў, гарэлі адзінай воляй, адзіным імкненнем лепш працаваць, даць большы эфект у сваёй рабоце.